УДК 821.161.3-1(09)+81.008:39(=161.3)

# Метафара як сродак рэпрэзентацыі канцэпту “неба” ў мове паэзіі Рыгора Барадуліна

**Дзядова А.С.**
*Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск*

У артыкуле праведзена даследаванне метафарычных выразаў, якія выступаюць у якасці моўных рэпрэзентантаў канцэпту “неба” ў паэтычных творах Р. Барадуліна.

Мэта працы – выявіць спецыфіку метафары як сродку рэпрэзентацыі канцэпту “неба” ў мове паэзіі Р. Барадуліна.

**Матэрыял і метады.** Навуковае даследаванне праведзена на матэрыяле зборнікаў паэзіі Р. Барадуліна. Пры аналізе моўнага матэрыялу выкарыстоўваліся апісальны і колькасна-статыстычны метады, а таксама метады канцэптуальнага і кампанентнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Да моўных сродкаў, якія ўваходзяць у намінатыўнае поле канцэпту “неба” ў паэтычных творах Р. Барадуліна, адносяцца наступныя: ключавое слова неба як рэпрэзентант канцэпту; кампазіта небасхіл, індывідуальна-аўтарскія неалагізмы небадол, небасхон, небасклеп; назоўнікі, якія абазначаюць пэўныя астранамічныя аб’екты – сонца, месяц, зоры як нябесныя свяцілы.

**Заключэнне.** Канцэпт “неба”, рэпрэзентаваны праз метафарычныя выразы, створаныя Р. Барадуліным, адносіцца да разраду ключавых канцэптаў беларускай ментальнасці, неабходных для разумення традыцыйнай культуры нашага народа, і іграе выключна важную ролю ў рэлігійнай, эмацыйнай і маральна-этычнай сферах яго жыцця.

**Ключавыя словы:** канцэпт, лексічная адзінка, ментальнасць, метафара, метафарычны выраз, мова мастацкага тэксту, моўная карціна свету.

# Metaphor as a Presentation Means of the Concept of the Sky in the Language of Rygor Baradulin’s Poetry

**Dziadova A.S.**
*Educational Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk*

A study of metaphor expressions which are powerful presentations of the concept of the sky in R. Baradulin’s poetic works is conducted in the article.

The article aims at identifying the specificity of the metaphor as a presentation means of the concept of the sky in the language of R. Baradulin’s poetry.

**Material and methods.** The research was conducted on the material of R. Baradulin’ collections of poems. The descriptive and the quantity-statistic methods as well as methods of concept and component analysis were used in the linguistic material analysis.

**Findings and their discussion.** The linguistic means which belong to the nomination filed of the concept of the sky in the poetic works by R. Baradulin include the following: the key word of the sky as the concept presenter; the sky composite, the individual author’s neologisms of nebadol, nebaskhon, nebasklep; name words which denote astronomic bodies like sun, moon, stars as celestial objects.

**Conclusion.** The concept of the sky presented through metaphor expressions created by R. Baradulin belongs to the class of the key concepts of Belarusian mentality which are necessary for understanding our people’s traditional culture. It plays a significant role in the religious, emotional as well as moral and ethical spheres of life.

**Key words:** concept, lexical unit, mentality, metaphor, metaphor expression, fiction text language, linguistic picture of the world.